УДК 94(476):37.091.12«18/19»

В. М. Астрога, дацэнт (БДТУ)

# САЦЫЯЛЬНЫ СТАТУС ВЫКЛАДЧЫКАЎ ГАРАДСКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

У артыкуле аўтар разглядае сацыяльны статус выкладчыкаў гарадскіх навучальных установ Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Падкрэсліваецца, што прававое становішча педагогаў рэгулявала шырокая нарматыўна-прававая база: законы, пастановы, цыркуляры і г. д. У пэўнай ступені разгледжаны праблемы падбора кадраў, матэрыяльнае становішча выкладчыкаў. Даецца параўнальны аналіз сацыяльнага становішча выкладчыкаў вясковых народных школ і павятовых гарадскіх вучылішчаў, гімназій. Паказаны некаторыя станоўчыя тэндэнцыі ў рэфармаванні сістэмы народнай адукацыі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

The article examines social status of the teaching staff of urban educational institutions in Belarus in the second half of XIX century and in the beginning of XX century. The article points out that the legal status of teachers was regulated by rather wide normative legal base, including laws, regulations, directives etc. Also, the article outlines the problems of staffing, level of teachers' wellbeing. The investigation includes the comparative analysis of social status of teachers of rural people schools, district urban schools and gymnasiums. Several positive trends in reformation of popular education system after the February Revolution in 1917 are pointed out. At the same time, it is demonstrated that the problem of improvement of legal and material status of teachers of urban educational institutions was not resolved.

**Уводзіны.** Сацыяльны статус – гэта становішча, якое займае індывід ці сацыяльная група ў грамадстве ці асобнай падсістэме грамадства. Вызначаецца ён па спецыфічных для канкрэтнага грамадства прыкметах, у якасці якіх могуць выступаць прававыя, эканамічныя, нацыянальныя, узроставыя і інш.

Спынімся на прававым і матэрыяльным становішчы настаўніцтва Беларусі азначанага перыяду. Прававое становішча гэтай часткі інтэлігенцыі рэгулявала шырокая нарматыўна-прававая база. Гэта былі законы, пастановы, цыркуляры, свабоды, абавязкі, дадатковыя ільготы, перавагі, законныя інтарэсы настаўнікаў. Менавіта прававы статус асобы быў і застаецца адным з вызначальных паказчыкаў узроўню дэмакратызацыі грамадства.

**Асноўная частка.** Фармальнае права выбару кандыдатаў на пасаду настаўніка школ Расійскай імперыі належала іх заснавальнікам (земствам, гарадскім і сельскім грамадствам, прыватным асобам). Аднак непасрэднае рашэнне прымаў інспектар народных вучылішчаў. Перавагу аддавалі кандыдатам з больш высокім адукацыйным узроўнем. Аб маральных якасцях кандыдатаў, іх схільнасці да педагагічнай дзейнасці пераконваліся шляхам пробных урокаў у адным з вучылішчаў. Канчатковае зацвярджэнне настаўнікаў і настаўніц на пасадзе належала павятовым саветам у канцы навучальнага года па прадстаўленні інспектара, які даваў ацэнку дзейнасці настаўніка. У шэрагу выпадкаў дапускалася назначэнне настаўнікам і без гадавой стажыроўкі. Кожны настаўнік пры назначэнні на службу прад'яўляў пасведчанне аб «добранадзейнасці» з канцылярыі генерала-губернатара і пры назначэнні прыводзіўся да прысягі «верна служыць і ва ўсім падпарадкоўвацца начальству». Пытанне аб недапушчэнні настаўніка да працы па прычыне «неблаганадзейнасці» вырашалася інспектарам і старшынёй савета вучылішча. Фармальнае права на звальненне заставалася за саветам. Звальненне і перамяшчэнне настаўнікаў вырашалася па-рознаму: у адных выпадках – з санкцыі павятовага савета вучылішча, у другіх – па рашэнню інспектара, павятовай земскай управы ці па прыгаворах гарадскіх і сельскіх грамадстваў.

З пачатку XX ст. ад настаўнікаў патрабавалася яшчэ падпіска аб непрыналежнасці да партый з канцылярыі губернатараў.

Непатрэбным прызнаваўся допуск асоб неправаслаўнай веры. Многія педагогі і грамадскія дзеячы крытыкавалі такую палітыку, калі кадры настаўнікаў папаўняліся выхадцамі з-за мяжы: «няўжо здаровую нацыянальную школу могуць стварыць замежныя настаўнікі, як чужыя інструктары – армію» [1, с. 341]. Неўзабаве прынята рашэнне, па якому іншаземцы, нават тыя, якія прынялі прысягу на падданства Расіі, не павінны былі назначацца на пасады настаўнікаў. Выключэнне складалі тыя з іх, хто нарадзіўся ў Расіі і быў праваслаўным.

Прызнанне годнасці і правоў асобы настаўніка ўказвала на неабходнасць поўнай рэарганізацыі створанага царскім рэжымам па-

ліцэйскага тыпу інспекцыі за выкладаннем. У многім дзейнасць Міністэрства народнай асветы характарызавалася бюракратычнай апекай. Інспектары, якія ўваходзілі ў склад саветаў вучылішчаў, у адносінах да кадравага пытання і пры рэвізіі навучальных устаноў павінны былі разглядаць і аналізаваць, у якім аб’ёме вывучаецца праграма, метады навучання, парадак нагляду за вучнямі, наведванне царквы, а таксама збіралі звесткі аб «тайных школах».

У другой палове XIX – пачатку XX ст. адчуваўся востры недахоп не толькі ў настаўніках для народных вучылішчаў, але і для гарадскіх навучальных устаноў Расіі. У 1901 г. было толькі 10 тыс. выкладчыкаў сярэдніх школ (у тым ліку ў школах Міністэрства народнай асветы каля 6 тыс. чалавек). Сярод іх толькі палова мелі вышэйшую адукацыю – як правіла, гэта былі выпускнікі універсітэтаў. Настаўніцы гімназій і прагімназій мелі пераважна сярэднюю адукацыю. У Віленскай навучальнай акрузе ва ўсіх гарадскіх вучылішчах працавалі толькі 340 настаўнікаў. Па адукацыйнаму цэнзу амаль усе яны закончылі курс у Віленскім настаўніцкім інстытуце.

Перадавая грамадскасць разумела, чаму пасля паўстання 1863–1864 гг. было паднята пытанне аб народнай адукацыі як аб лепшым сродку для супрацьдзеяння польскім пачаткам», чаму «прыцягнуты да займання настаўніцкіх пасад лепшыя рускія сілы са звальненнем палякаў». Апякун акругі І. П. Карнілаў у запісцы М. М. Мураўёву «Аб замене польскіх настаўнікаў рускімі» (1864 г.) заўважаў, што настаўнікамі з Расіі павінны быць заменены найперш усе выкладчыцкія месцы ў гімназіях, прагімназіях і трохкласных павятовых вучылішчах, бо «штодзённы вопыт запэўнівае, што дастаткова прысутнасці аднаго настаўніка-паляка, каб пазбавіць педсаветы ўсякай сілы і перашкаджаць узаемнаму даверу і абмену думкамі» [2, с. 82]. Разам з тым, адкрытая рэвалюцыйнасць не была характэрна для большасці настаўнікаў. Настаўнікі, якія знаходзіліся на дзяржаўнай службе, звычайна не адважваліся канфліктаваць з начальствам.

Настаўнікі былі абавязаны аказваць павагу да вышэйшага начальства, прымаць ад яго загады і дакладна іх выконваць «без усялякіх спрэчак». Любая непавага да начальства, якая праяўлялася ў справах службы пісьмова ці вусна, каралася па закону.

У Расійскай імперыі ўсім служачым чыноўнікам забаранялася друкаваць творы, у якіх змяшчалася інфармацыя аб знешняй і ўнутранай палітыцы дзяржавы. Многія апекуны і дырэкцыі скардзіліся, што насуперак забароне некаторыя настаўнікі змяшчаюць у часопісах артыкулы, якія тычацца не педагагічных, а агульных пытанняў. Настаўніку «нет неабходнасці шукаць падтрымкі часопісаў і публічна скардзіцца аб сваіх часта ўяўных няшчасцях і інтрыгах, якія паўстаюць на шляху яго дзейнасці. Такія “выкрыванні” не сумясцівы з годнасцю вучылішча, хутчэй падрываюць, чым умацоўваюць веру да яго і адцягваюць настаўніка ад сапраўднай справы... Ад настаўніка патрабуецца спакой, самавалоданне і атсутнасць усяго, што вызывае». Начальства лічыла, што гістарычныя і жыццёвыя патрабаванні не могуць быць ні задаволены, ні адменены выказваннем асабістага пачуцця, таму палеміка ў часопісах і розныя выказванні не могуць паскорыць альбо замарудзіць паступальны ход справы, і таму ўяўляюцца бескарыснымі і выклікаюць толькі шкодную смуту ў настроях грамадства [3, с. 801–802].

У перадавой літаратуры XIX ст. прыводзяцца такія факты: у Германіі і Францыі, напрыклад, існуе цесная сувязь паміж універсітэтамі і гімназіямі, а многія выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў з’яўляліся сур’ёзнымі вучонымі-даследчыкамі. Іх навуковая дзейнасць ставілася педагогам не ў дакаранне, а ў заслугу. Пад педагогам у расійскіх кіруючых колах разумеўся звычайна чалавек, які валодае толькі адной рамесніцкай тэхнікай навучання. Выкладчыкам, якія думалі шырэй і не пагаджаліся з поглядамі «некаторых уплывовых асоб», імкнуліся «зажаць рот». У выпадку, калі настаўнік праявіў якую-небудзь самастойнасць, яму пагражалі выгнаннем і беднасцю. «Педагог нават не меў такіх правоў, якія мае катаржнік. Катаржнік ведае, што калі яго пакараюць, то будуць карміць. Педагога з сям’ёй выкідвалі спакойна на маставую». Таму, як адзначаюць перадавыя дзеячы адукацыі, у краіне неабходна карэнным чынам мяняць адносіны да настаўнікаў, цаніць яго навуковыя заслугі, грамадскую пазіцыю. Гэтыя асобы будуць карыстацца маральным аўтарытэтам ў педагагічным свеце. Павага будзе заснавана не на ўгодніцтве, а на сапраўдных заслугах, прысвечаных асвеце і адукацыі грамадства [4, с. 192–193].

Часовы урад, які прыйшоў да ўлады ў выніку Лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі 1917 г., адмяніў шэраг састарэлых і рэакцыйных распараджэнняў царскіх улад у галіне адукацыі. У прыватнасці, цыркулярам апекуна Віленскай навучальнай акругі падкрэслівалася, што «асобы педагагічнага персаналу навучальных устаноў усіх тыпаў Міністэрства народнай асветы, выключаныя са школ пры ранейшым рэжыме за палітычную дзейнасць (па суду, у ад-

міністрацыйным і дысцыплінарным парадку), належаць бесперашкоднаму дапушчэнню да выкладчыцкай дзейнасці ў выпадку падачы імі хадайніцтва аб гэтым пры наяўнасці адпаведных вакансій» [5, л. 7]. Такім чынам, былі адменены ўрадавыя і міністэрскія дырэктывы, указанні аб недапушчэнні да педагагічнай дзейнасці «палітычна недобранадзейных» асоб, забароне настаўнікам і вучням мець дачыненне да палітычнай дзейнасці (прыняты цыркуляр «Аб прыёме ў навучальныя ўстановы асоб, якія раней былі выключаны за палітычныя альбо рэлігійныя перакананні»), аб забароне настаўнікам ствараць саюзы і праводзіць сходы, аб строгіх абмежаваннях педагагічных курсаў і з'ездаў. Былі ануляваны абмежаванні правоў на адукацыю і педагагічную працу па расавых, нацыянальных і рэлігійных прызнаках, у тым ліку антысеміцкія цыркуляры афіцыйных органаў аб недапушчэнні яўрэяў да педагагічнай дзейнасці [6, с. 73].

Адметнай рысай усіх рускіх школ з'яўлялася іх беднасць: ні прыстойнага памяшкання, ні добрых вучэбных дапаможнікаў, ні дастатковай колькасці добра падрыхтаваных настаўнікаў. Настаўнік пачатковай школы ў царскай Расіі быў чалавекам бяспраўным і часам не меў мінімальнага матэрыяльнага дастатку. «Незабяспечанае становішча народнага настаўніка ўяўляе адно з самых слабых месцаў нашай школьнай справы», – пісаў школавед П. Салонін. Сярэдні заробак настаўніка ў канцы 1870-х гг. складаў 200–250 руб. у год ці 16–20 руб. у месяц, 66 кап. у дзень, 16 кап. за адзін урок, калі лічыць па 4 урокі ў дзень [7, с. 128– 129]. Атрыманне «жалавання» з валаснога праўлення, нават пры добрых адносінах з яго кіраўніцтвам, звязана было з вялікімі нязручнасцямі. Грошы выплачвалі з затрымкай 3–6 месяцаў, у той час, як міністэрскім цыркулярам 1878 г. патрабавалася, каб заробак настаўнікам выдаваўся штомесяц у вызначаны тэрмін. Калі адносіны з настаўнікам былі дрэнныя, то, акрамя несвоечасовых выплат, можна было пачуць ад валасных старшынь зневажальныя словы. Калі грошы прывозіліся ў школы, то казначэі, пісары, старшыні за сваю «працу па дастаўцы жалавання» і за «клопаты аб настаўніку» ўтрымлівалі іх частку на сваю карысць. Нізкі ўзровень матэрыяльнага забеспячэння настаўніцтва адмоўна адлюстроўваўся на становішчы народнай школы. Наколькі сумна адлюстроўвалася на становішчы народнай школы крайняя мізэрнасць матэрыяльнага забеспячэння настаўнікаў, сведчылі такія факты, як спыненне дзейнасці многіх школ у выніку пераходу настаўнікаў на больш выгадную службу ў паліцэйскае ці акцызнае ведамства.

Настаўнікамі 4-класных гарадскіх вучылішчаў назначаліся асобы, якія прайшлі курс навучання ў настаўніцкіх інстытутах. Гарадскія вучылішчы адкрываліся як у гарадах, так і ў вёсках. Але, як заўважалі сучаснікі, «у вясковае гарадское вучылішча ніякім спосабам не заманіш настаўнікаў ...вёска ім падаецца ссылкай, маладыя... баяцца цёмнай, некультурнай вёскі, баяцца ў такой глушы страціць сувязь з інтэлігентным светам». Трэба яшчэ дабавіць «надзею на большую матэрыяльную забяспечанасць у горадзе пры дапамозе дадатковых заняткаў». Заработная плата ў горадзе была некалькі вышэйшай, але разам з тым, як адзначаецца ў анкетных лістах, «па пацёртаму, заношанаму касцюму ў нас пазнаюць настаўнікаў гарадскіх вучылішчаў». «Шлюб ёсць роскаш для настаўніка гарадскіх вучылішчаў... ажаніцца – значыць зрабіць злачынства», памножыць сваю беднасць. Характэрным паказчыкам незабяспечанасці з'яўляюцца частыя пераводы (сярэдняя працягласць службы на адным месцы 4,4 года), бо нават «невялікае матэрыяльнае паляпшэнне лічыцца дастатковым повадам для настойлівага патрабавання пераводу» [8, с. 297]. У гэтай сувязі адзначым, што, напрыклад, па Мінску ў 1893 г. настаўнік гарадскога вучылішча атрымліваў 300 руб. у год, а настаўніца – 185.

Больш высокай у Расійскай імперыі была заработная плата настаўнікаў прагімназій, гімназій, рэальных вучылішчаў і настаўніцкіх семінарый, і асабліва дырэктараў сярэдніх навучальных устаноў. У 70-х гг. XIX ст. дырэктар гімназіі пры казённай кватэры атрымліваў 2 тыс. руб. у год, інспектар – 1500 руб., настаўнікі навук і моў у межах 1 тыс. руб., законанастаўнік – 900 руб., настаўнікі чыстапісання – 250 руб. у год. Абавязковая вучэбная нагрузка настаўніка была 12 урокаў у нядзелю.

У наступныя гады пры аплаце працы настаўнікаў былі ўведзены 4 разрады ў залежнасці ад выслугі гадоў у адной і той жа навучальнай установе. Аклады настаўнікаў гімназій некалькі выраслі. У 1912 г. быў прыняты закон аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча служачых у сярэдніх агульнаадукацыйных мужчынскіх навучальных установах і акружных інспектараў. Настаўнікам навук і моў з вышэйшай адукацыяй былі ўстаноўлены аклады: у першыя пяць гадоў службы – 900 руб. Дадатковыя ўрокі (звыш устаноўленых) аплачвалі па 75 руб. за адзін. Класныя настаўнікі за загадванне адным класам звыш настаўніцкага аклада сталі атрымоўваць 600 руб. у год. Дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута ў 1914 г. атрымліваў 2500 руб. у год, а настаўнікі навук і законанастаўнік – па 1440 руб. [9, л. 7].

Такім чынам, становішча выкладчыкаў сярэдняй школы было значна лепшым. Выхадцы, галоўным чынам, з дваранскіх альбо заможных буржуазных класаў, яны мелі вышэйшую адукацыю і ім прызначаліся добрыя аклады. Так, настаўнік Мінскай духоўнай семінарыі Тавараў за 1893 г. атрымаў 823 руб. [10, с. 62].

У пачатку ХХ ст., як і ў цэлым у Расійскай імперыі, так і на Беларусі, матэрыяльнае становішча настаўнікаў гімназій было даволі добрым. Грашовае ўтрыманне настаўніка гімназіі вызначалася ў залежнасці ад адукацыі, педагагічнага стажу і вучэбнай нагрузкі. Ні адзін штатны настаўнік Мінскай мужчынскай гімназіі, які меў вышэйшую адукацыю, не атрымліваў менш за 2350 руб. у год. Памер заработнай платы некаторых настаўнікаў дасягаў 3–4 тыс. руб. Асабліва высока аплачваліся пасады дырэктараў і інспектараў гімназій. Акрамя аклада і платы за выкладчыцкую працу ў гімназіі, яны атрымлівалі значныя сумы ў выглядзе «кватэрных» і «сталовых». Напрыклад, дырэктар Віцебскай гімназіі атрымаў у 1913 г. у агульным выглядзе 4260 руб., выконваючы абавязкі інспектара Мінскай гімназіі – 4225 руб. [11, с. 83].

З пачатку стагоддзя ў сярэдніх навучальных установах дадаткова да асноўнага акладу пачалі плаціць прыбаўкі ў памеры 400 руб. за кожныя 5 гадоў службы [12, с. 68]. Пры гімназіях, настаўніцкіх семінарыях і інстытутах настаўнікам, якім патрабавалася жыллё, прадастаўляліся ў бясплатнае карыстанне казённыя кватэры ў так званым «вучылішчным доме». Звычайна яны мелі (калі настаўнік сямейны) 3–4 пакоі. Калі магчымасці не дазвалялі забяспечыць усіх жадаючых пакоямі, настаўнікам дадаткова выдаваліся «кватэрныя грошы», дастатковыя для найма добрай кватэры (у сярэднім кватэрныя грошы складалі каля 40% ад гадавога жалавання настаўніка).

Для таго каб утрымаць настаўнікаў ад пошуку дадатковага заробку, не звязанага з педагагічнай дзейнасцю, апекуны Віленскай навучальнай акругі дазвалялі выкладчыкам гімназіі даваць прыватныя ўрокі вучням сваіх класаў. Аплата такіх урокаў была даволі высокая. Напрыклад, памер аплаты прыватных заняткаў з адным вучнем на працягу месяца складаў адну дзесятую месячнай заработнай платы настаўніка. Дзеці настаўнікаў сярэдніх і ніжэйшых устаноў вызваляліся ад платы за вучобу ў гімназіях і прагімназіях, калі іх бацькі праслужылі ў ведамстве Міністэрства народнай асветы не менш за 10 гадоў.

Пры размеркаванні срокаў гімназіі педагагічнымі саветамі прадугледжваўся такі артыкул выдаткаў, як аказанне матэрыяльнай дапамогі настаўнікам і заахвочванне іх поспехаў у педагагічнай і навуковай дзейнасці. Памер грашовых узнагарод мог складаць да 50% гадавога «жалавання». Такога паняцця, як бюлетэнь, для настаўніка, які захварэў, у дарэвалюцыйнай школе не было. Але зварот хворага выкладчыка гімназіі да дырэктара з просьбай аб выдзяленні матэрыяльнай дапамогі для лячэння ці паездкі на курорт, як правіла, задавальняўся за кошт сродкаў гімназіі.

Настаўнікі гімназій і рэальных вучылішчаў мелі значна больш правоў і пераваг, чым настаўнікі народнах школ. У большасці яны ўзнагароджваліся чынамі, ардэнамі і грашовымі прэміямі. Дырэктары гімназій па выслузе гадоў атрымлівалі чын V класа, інспектары гімназій пасля чатырох гадоў службы мелі VI клас, настаўнікі асноўных навук гімназій – VIII клас, настаўнікі чыстапісання – IX клас, памочнікі класных настаўнікаў – X клас. Праз пэўны тэрмін праводзілася павышэнне ў чынах. «Нормай» пры ўзнагароджаннях была адна ўзнагарода ў год на 8 служачых. Настаўнікі сярэдніх навучальных устаноў мелі больш правоў і пры атрыманні пенсій [13, с. 137–138].

**Заключэнне.** У гэты перыяд значна вырас разрыў паміж патрэбай у педагагічных кадрах і ўзроўнем задавальнення гэтай патрэбы. Такі разрыў рос з года ў год. Царскі ўрад не толькі не прадпрымаў рашучых мер, каб яго зменшыць, але і ўсяляк абмяжоўваў развіццё педагагічнай і народнай адукацыі. Аднак прад'яўленне грамадствам і кіраўніцтвам вучылішчаў высокіх патрабаванняў да ўзроўню адукацыі, культуры прафесійных і асабістых якасцей педагога, прадастаўленне настаўніку прасторы для творчасці і стварэнне неабходных умоў для павышэння яго агульнаадукацыйнага і прафесійнага ўзроўню садзейнічалі таму, што ў гарадскіх сярэдніх навучальных установах пераважалі настаўнікі адукаваныя, кампетэнтныя, адданыя сваёй справе.

## Літаратура

1. Алешинцев, И. История гимназического образования в России (XVIII и XIX век) / И. Алешинцев. – СПб.: Изд. О. Богдановой, 1912. – 346 с.

2. Корнилов, И. Русское дело в Северо-Западном крае: материалы по истории Виленского учебного округа преимущественно в муравьевскую эпоху / И. Корнилов. – СПб.: Тип. А. Суворина, 1908. – Вып. 1. – 504 с.

3. Настольная книга по народному образованию: в 3 т. / сост. Г. Фальборк, В. Чарнолуский. – СПб.: Тип. Б. М. Вольфа, 1901. – Т. 2. – С. 715–1538.

4. К вопросу о подготовке преподавателей средних школ. – М.: Тип. Г. Лисснера и А. Гешеля, 1899. – 306 с.

5. НГАБ. – Фонд 478. Мінскі настаўніцкі інстытут. – Воп. 1. – Спр. 82.

6. Снапкоўская, С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 1998. – 191 с.

7. Солонин, П. Училищеведение / П. Солонин. – СПб.: Тип. А. Суворина, 1879. – 343 с.

8. Труды первого Всероссийского съезда учителей городских по положению 1872 г. училищ 7–14 июня 1909 г.: в 2 т. / под ред. В. А. Самсонова и Г. Г. Тумина. – СПб.: Тип. Моятвида, 1910. – Т. 1. – 529 с.

9. НГАБ. – Фонд 478. – Воп. 1. – Спр. 7.

10. Шыбека, З. В. Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З. В. Шыбека, С. В. Шыбека. – Мінск, Полымя, 1990. – 329 с.

11. Еўдакімава, А. З вопыту падрыхтоўкі настаўнікаў для Беларусі (XIX ст.) / А. Еўдакімава // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 1. – С. 75–85.

12. Сучков, И. В. Социальный и духодный облик учительства России на рубеже XIX–XX веков / И. В. Сучков // Отечественная история. – 1995. – № 1. – С. 62–67.

13. Паначин, Ф. Г. Педагогическое образование в России / Ф. Г. Паначин. – М.: Педагогика, 1979. – 215 с.

*Паступіў 02.04. 2010*